№ 10 (39) Чацьвер, 31-га сакавіка 1927 г. м. Вільня Год II.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальн… …рыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакраты… …унізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпіс…

Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Ludwisarska 5 m 2.
…цыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
" " сярод тэксту —25 гр.
" " на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

ПАТРЭБА КАНТРОЛЮ.

Самым неабходным варункам жыцьця чалавека ёсьць яго жыльлё.

А так сталася, што пасьля ўсіх войнаў, якія пажарышчамі пракатываліся па нашым землям, да гэтага часу шмат насяленьня ня мела нават самых бедных хатак. Туліліся людзі ў кінутых немцамі, напоўразваліўшыхся зямлянках, бараках і т. д. у немагчымых антысанітарных варунках. І ці ж ня была найвялікшым праступленьнем усіх папярэдніх урадаў, што бяручы падаткі на роўнай меры з гэтых агалелых, скалечаных і маральна і фізычна ахвяраў вайны і бежанства ўлада брала ад іх падаткі, не даўшы ім ад Дзяржавы дапамогі на адбудаваньне свайго ўласнага жыльля, якое была прынесяна ў ахвяру ў барацьбе з ворагам.

Друкуючы ніжэй заметку польскіх газэтаў аб тым, што сучасны Ўрад нарэшце зразумеў *неабходнасьць* прыйсьці з дапамогай гэтым ахвярам вайны, мы сустракаем яе з вялікім задаваленьнем.

Хто бліжэй знаёмы з сельскай гаспадаркай, той толькі можа зразумець, якое вялізарнае значэньне маюць для гаспадара — селяніна забудаваньні. Проста скажам, што без забудаваньняў весьці сельскую гаспадарку немагчыма. Так і была, што бежанцы, якія варочаліся на сваё пажарышча, гэткай гаспадаркі, якую вялі да вайны, яны ня мелі сілаў. Але ў першыя гады можна была яшчэ то тутака та тамака знайсьці працу. Сяньня працы нідзе ня знойдзеш, а дзеля гэтага хоцькі няхоцкі б. бежанец мусіць усе свае надзеі палажыць на свой кавалачак зямлі і заняцца выключна гаспадаркай. Вось дзеля чаго пастанова Ураду прыйсьці з шырокай дапамогай вёскам зьнішчаным вайною ёсьць *мерай* асабліва *на часе*. Аднак жа досьлед многіх іншых распараджэньняў цэнтральнай улады паказаў, што не заўсёды пляны *цэнтру* выконваюцца *мейсцовымі* уладамі, як гэта хацеў бы цэнтр і як таго патрабуе інтарэс Дзяржавы. Прычынай гэтага ёсьць тое, што мы *не маем грамадзянскага кантролю*, які б мог бы дапільнаваць распараджэньні цэнтру. Гэтае зьяўляецца зноў дзеля таго, што мы ня маем самаўраду. У той час, як Соймік і Рада гміннaя павінны мець гэты кантроль, як інстытуцыі грамадзка выбарныя, яны ў нас фактычна зьяўляюцца *паслухмянымі і безгалоснымі* органамі паноў старостаў і войтаў.


Праўда цяпер ідзе многа гутарак аб новых выбарах у самаўрады, але гутаркі ідуць, а жыцьцё не чакае.

Дзеля гэтага ў гэтак важнай галіне як адбудова, грамадзянства павінна само выявіць пэўную грамадзкую актыўнасьць і само на мяйсцох даглядзець, каб ня было крыўдаў і надужыцьцяў з будульцам і грашыма, якія ўрад будзе адпускаць на будову. Дзеля гэтага мы зварачваемся да ўсіх сваіх прадстаўнікоў, сябраў і да ўсяго беларускага грамадзянства быўшай прыфрантовай паласы, каб яны па магчымасьці паведамлялі нас аб усіх распараджэньнях па адбудове, як яна ідзе на мейсцох, ці хто пакрыўджаны і г. д. Прэса ёсьць голас грамадзянскі і яна павінна заняць мейсца нехапаючага кантролю ў нашых самаўрадах.

Адначасова мы з задаваленьнем канстатуем, што пастановы Зьезду Заходняй Беларусі і яшчэ зусім недаўна адбытых канфэрэнцый у Баранавічах, Гарадні і Дзятлаве, якія ў сваіх рэзалюцыях падкрэсьлілі патрэбу прыйсьці з урадовай дапамогай тым пакрыўджаным вайной сялянам, якія да гэтага часу не атрымал ніякай дапамогі на адбудову выпаўняюцца.

Адначасова зазначаем, што гэтая мера, як пачатак гаспадарчых рэформаў безумоўна зробіць уплыў на хуткае аздараўленьне атручанай Грамадой і іншымі комунізуючымі элемэнтамі крэсовай атмасфэры.

Імяніны марш. Пілсудскага



У дню 19 сакавіка ўся Польшча надзвычай урачыста сьвяткавала дзень імянін Галавы Ўраду і правадыра арміі марш. Пілсудскага. Ува ўсіх гарадах адбыліся парады і ўрачыстасьці. На фатаграфіі бачым адзін з гэткіх парадаў, які адбыўся ў Кракаве.

Зьезд Беларускай Нацыянальнай Рады у Клецку.

У дню 21 сакавіка ў м. Клецку павету Несьвіскага адбыўся зьезд прадстаўнікоў і сымпатыкаў Бел. Нац. Рады. На першую палову зьезду, на якую былі дапушчаны ўсе жадаючыя — зьявілася шмат народу, які перапоўніў салю „народнага дому", гдзе адбываўся зьезд.

Гэткага падзелу на два варожых лагэры, які меў мейсца ў Дзятлаве — ў Клецку ня было, што тлумачыцца тым, што Бел. Нац. Рада ў Несьвіскім павеце мае вялікі ўплыў, які расьцярушыў зусім Грамаду. Дзеля гэтага ня толькі паліцыі ня было чаго рабіць падчас Зьезду, а нават ня прышлося пільнаваць парадку вызначаным дружыньнікам Рады з беларускімі бела-чырвона-белымі павязкамі на руках

Рэфэраты прачыталі старшыня Б.Н. Рады п. Паўлюкевіч па пытаньню агульна-палітычнаму, ад „Прасьветы" Друцкі—Падбэрэскі і ад "Белар. Слова" п. рэдактар Т. Вернікоўскі. Усе рэфэраты былі спатканы прысутнымі воплескамі. Пасьля рэфэратаў адбылася другая палова Зьезду пры ўдзеле выключна сябраў. Быў адчытаны рад дакладаў з мейсц. Пасьля дакладаў адбылася дыскусія і прынята рэзалюцыя. Зьезд адбыўся ў сымпатычнай абстаноўцы і сканстатаваў хуткі рост уплываў Бел. Нац. Рады, як праўдзіва нацыянальнай, надклясоваай арганізацыі.

Рэзалюцыя

Канфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады ў Клецку 21 сакавіка, 1927 г.

Канфэрэнцыя сьцьвярджае:

1) Узрост уплываў кірунку праўдзіва-нацыянальнага і надклясовага, які прадстаўляе Беларуская Нацыянальная Рада.

2) Узрост сьвядомасьці беларускіх масаў у галіне так палітычнай, як і грамадзкай.

3) Імкненьне насяленьня да пашырэньня роднае культуры

і пастанаўляе:

а) Аб'еднацца каля сваіх нацыянальных арганізацый.

б) Прыняць за падставу працы пастановы Акружнай Канфэрэнцыі Б. Н Р. у Баранавічах, якая адбылася 8 лютага 1927 г.

в) Даручыць Т ву „Прасьвета" прасіць Пана Міністра Рэлігійных Веравызнаньняў і Публічнае Асьветы, аб прадаўжэньні тэрміну складаньня кваліфікацыйных экзаменаў да году 1930.

Камунікат Беларускай Нацыянальнай Рады.

Апошнімі днямі як на імя старшыні Рады, так і на імя рэдактара нашага органу пачалі масова паступаць заявы грамадаўцаў аб выхадзе з Грамады з далучэньнем чырвоных білетаў. Гэтыя заявы аб выхадзе частагуста падаваліся разам з просьбамі аб прыняцьці гэтых былых сябраў Грамады да Т-ва „Прасьвета" і да Бел. Нац. Рады.

Дзеля таго, што Грамада і Н.Ц.Х. аб'яўлены партыямі нелегальнымі — Бел. Нац. Рада гэтым даводзіць да ведама як сваіх сэкрэтарыятаў, так і ўсяго грамадзянства, што больш прымаць чырвоных грамадаўскіх і зялёных энпэхоўскіх білетаў ня будзе. Адначасова Б. Н. Р. даводзіць да ведама ўсіх грамадаўцаў, якія бы, *незалежна ад ліквідацыі Грамады*, праканаўшыся ў шкадлівасьці працы Грамады хацелі бы ўзяць прыклад з тых сваіх сябраў, якія *выйшлі з Грамады да ліквідацыі* і здужалі замясьціць свае заявы ў нашэй газэце — што заявы іх аб прыняцьці ў сябры Бел. Нац. Рады і „Прасьветы" будуць прымацца толькі пасьля пісьменнай заявы іх аб ідэйным разыходжаньні з Грамадою.

Гэтыя заявы разам з просьбамі аб залічэньні ў сябры Рады ці „Прасьветы" можна перасылаць па адрасу рэдакцыі газэты на імя Бел. Нац. Рады, альбо складаць безпасрэдна сэкрэтарыятам і прадстаўнікам Бел. Нац. Рады на мейсцох.

Прэзыдыум Беларускай Нацыянальнай Рады.

Вільня, 24 сакавіка 1927 г.

Да Грамадзянства.

Урад пастанавіў прыступіць да адбудовы гаспадарак — зьнішчаных вайною. Дзеля гэтага, апрача дарогі афіцыяльнай праз гміны, прапануем **усім сялянам**, гаспадаркі якіх зьнішчаны падчас вайны, — прыслаць копіі сваіх паданьняў аб адбудове да Беларускай Нацыянальнай Рады. У паданьні павінна быць падрабязна выясьнена, калі гаспадарка зьнішчана, ад якіх прычынаў, у якім годзе, якія былі забудаваньні і г. д.

Заявы прысылаць як найхутчэй.

Беларуская Нацыянальная Рада.

Адбудова зьнішчаных падчас вайны гаспадарак.

На прапазыцыю віленскага ваяводзтва ўрад мае прыйсьці з дапамогай насяленьню, пражываючаму на паўночна-усходніх землях, у адбудове ўласных гаспадарак.

Да гэтага часу на гэтых абшарах каля 60,000 насяленьня жыве ў зямлянках, ня маючы сродкаў на адбудову зьнішчаных падчас вялікае і бальшавіцкае вайны гаспадарак.

Каб зрабіць гэтую акцыю магчымай урад выдаў рад распараджэньняў, пазваляючых у мясцовасьцях, багатых лесам, на карыстаньне дзеравам на найбольш лагодных варунках. У мясцовасьцях бязлесных, будзе распачата будова г. зв. глінабітных дамоў.

Каб гэтую будову правесьці у магчыма скарэйшым часе, урад арганізуе ў Вільні інструктарскі курс, для спэцыялістаў.

Курс аблічаны на 300 слухачоў.

Такім чынам урад мае ўсе даныя, што да восені некалькі тысячаў дамоў будзе выбудавана. На мэты гэтай акцыі ўрад вызначыў вельмі паважныя крэдыты.

Палітычны агляд.

Два апошніх тыдні ўся Эўропа жыла пад уражаньнем італьянска-сэрбскага канфлікту, ад якога запахла порахам у паветры. Перад гэтым канфліктам нават кітайскія падзеі адыйшлі часова на другі плян, ня глядзячы на ўсю іх павагу. І хаця небясьпека новага выбуху балканскага вулкана быццам прайшла, але цікава ўсё-ж такі больш драбязгова разабрацца ў сутнасьці балканскага канфлікту, які ледзь ня стаў паўтарэньнем сарайскага выстралу ў 1914 г., выклікаўшага сусьветную вайну.

Яблыкам спрэчкі ці косьцю, з-за якой ледзь не перакусаліся палуднёва-эўрапэйскія народы, зьяўляцца Албанія. Албанія гэтак сама як Партугалія ці Мэксыка ў апошнія гады вядома тым, што ў ёй амаль ня кожны сэзон выбухае рэвалюцыя. Гэта невялічкая рэспубліка, якая ляжыць на паўдня ад Юга-Славіі сярод высокіх, дзікіх і недаступных гор, спускаючыхся к пабярэжжу Адрыатычнага мора, над якім выключнае права хоча мець адна Італія. На тэррыторыі ў 28,000 кв. кілёмэтраў жыве каля 830,000 жыхароў рожных гаворкаў веры і паходжаньня, якіяназваны супольным імям албанцаў. Албанія паўстала толькі ў 1912 г. пасьля балканскай вайны з некалькіх турэцкіх вілайэтаў, якія хацела загарнуць да сябе Сэрбія і Грэцыя, але на гэта не згаджаліся вялікія дзяржавы, кожная з якіх сама хацела палажыць на яе сваю „апякунчую" руку. Нарэшце Вільгельму II пашанцавала паставіць у Албаніі свайстаўленьніка нямецкага прынца Віда, які пасьпеў зрабіць чужаземную пазыку ў 10 міл. марак для будовы каралеўскага двара і з выбухам сусьветнай вайны ўцёк з Албаніі ў аўстрыяцкую армію, зразумела з пазычанымі мільёнамі, за якія адпавядалі албанцы. З гэтага часу на Албанію, як на лакомы кусок, застаўшыйся бяз гаспадара, зьвярнула сваю ўвагу Італія. У 1915 г., каб перацягнуць Італію на свой бок, хаўрусьнікі падпісалі з ёю ў Лёндане дагавор, на моцы якога Албанія перадавалася пад яе гэгэмонію. Але ў 1920 г. Албанія была прынята ў склад сябраў Лігі Народаў, а ў 1921 г. канфэрэнцыя Пасloў у Парыжу скасавала лёнданскі трактат, прызнаўшы ўсе ж „спэцыяльныя" правы Італіі ў Албаніі. Гэта, як мы пабачым далей і служыць прычынаю безканечных непаразуменьняў на Балканах.

Італія, як ведама, задыхаючыся ад лішкі насяленьня, імкнецца к распаўсюджаньню сваей экспансіі на Балканах і Бл. Усход. Албанія-ж як па свайму гэографічнаму палажэньню, гэтак сама і па ўнутранаму строю прадстаўляе найлепшую базу для Італіі на Балканах, адкуль можна пачаць далейшую акцыю. І італьянскі ўрад упарта ідзе ў гэтым кірунку. У 1925 г. быў заснаваны албанскі эмісыйны банк (Албанія ня мае нават уласнай валюты), 50 прац. акцыяў якога знаходзіцца ў руках італьянскіх капіталістаў і сядзібаю якога вызначаны Рым. Затым італьянцы прыступілі к адбудове албанскіх марскіх партоў (Дурацца), шасэйных

Прэзыдэнт Албаніі.



Падтрымліваны Італіяй прэзыдэнт Албаніі Ахмэт Бей Зогу.

дарог, каналаў. Атрымалі канцэсіі на нафту, вугаль і медзь. І нарэшце, каля 2-х месяцаў таму назад, у Ціране быў падпісаны італьянска-албанскі гарантыйны дагавор, які поўнасьцю перадае Албанію пад уплыў Італіі. Албанскі прэзыдэнт Ахмэд Зогу Бэй зьяўляецца поўным васалам Італіі, якім быў прынц Від у адносінах даваеннай Нямеччыны.

Уяўненьне гэтага трактату зрабіла вельмі прыкрае ўражаньне як на Юга-Славію якая забіла трывогу, добра разумеючы, якая небясьпека пагражае яе палітычным і эканамічным інтарэсам на Балканах. Але дзякуючы саўпадзеньню многіх іншых падзеяў у Эўропе і Кітае, ніхто з эўрапэйскіх дзяржаў ў не падтрымаў голасу ўстрывожанай Юга-Славіі апрача аднэй Францыі. Нават больш таго. Англія за прылучэньне Італіі к супольнай акцыі проці Радавай Расеі і прызнаньне бэсарабскай канвэнцыі дала поўную свабоду дзейства Італіі на Балканах. У гэты час, як аб гэтым ужо гаварылася ў папярэднім палітычным аглядзе, Італія ўвайшла ў цесны кантакт з Румыніяй, Баугарыяй, Вэнгрыяй і нават Грэцыяй. А каб заткнуць Юга-Славіі глотку і знайсьці пратэкст для аканчальнай акупацыі Албаніі, як гэта было зроблена ў сваім часе з Фіуме, ці Трыестам, які быў захоплены „узбунтаваўшымся" Д'Анунцыям, дык Італія ў сваю чаргу забіла трывогу, быццам Юга-Славія готовіцца да аружнага нападу на Албанію. А дзеля таго, што Італія падпісала з Албаніяй пакт прыязьні, і забавязалася бараніць яе незалежнасьць, дык адсюль вынікае, што яна павінна прыняць адпаведныя контр-меры. Адсюль выйшла дзіўная рэч: Юга-Славія пратэстуе проці італьянскіх аружных плянаў на Балканах, а Італія — наадварот. І быў гэтакі крытычны мамэнт, што можна было кожную хвілю чакаць выбуху балканскага вулкана, і гэта пасьля таго, як між Італіяй і Юга-Славіяй гэтак сама каля года таму назад быў падпісаны тракгат згоды. Падчас дыскусіі над гэтай справай ў Скупшчыне (Юга-Славянскі парлямэнт) мівістр заграпічных справаў Пэрыч, запярэчыўшы ілжывым абвінавачаньням Юга-Славіі ў збройным рыхтаваньні проці Албаніі, і катэгарычна выступіўшы проці агрэсыўных плянаў Італіі, падкрэсьліў стары лёзунг „Балканы для балканцаў". А адзін з паслоў у часе прамовы крыкнуў, зьвяртаючыся ў бок прысутнага на паседжаньні італьянскага пасла: „тут яму ня месца". І за такі пастулак ня было нават перапросінаў з боку афіцыяльных чыннікаў.

Але італьянская фашыстаўская прэса гэтак сама не засталася ў доўгу, патрабуючы ўстрыманьня сэрбаў, якія быццам пагражаюць эўрапэйскаму міру. Італьянскі Ўрад выступіў у Парыжу, Лёндане і Бэрліне з акружнаю нотаю, у якой указвае на ўваружэньне Юга-Славіі і небясьпецы для албанскай незалежнасьці. Сэрбскі Ўрад выступіў з адпаведнымі крокамі перад указанымі дзяржавамі пры пасрэдстве іх паслоў ў Белградзе. Пачаўся абмен паглядаў між Парыжам, Лёнданам і Бэрлінам. Нават высоўвалася канцэпцыя склікаць надзвычайную сэсію Рады Лігі Народаў для абгаварэньня гэтага пытаньня, дзеля таго, што ўсе заінтэрэсаваныя стораны зьяўляюцца сябрамі Лігі Народаў. Але паволі гэтае напружаньне аслабела і хвілёва можна лічыць канфлікт уладжаным. Але толькі хвілёва, бо Італія не адмовіцца ад сваіх плянаў на Балканах, а гэта раней ці пазьней ўсё роўна прывядзе к аружнаму канфлікту.

Каб запярэчыць несправядлівым абвінавачаньням Юга-Славянскі Ўрад з першага пачатку канфлікту дакляраваў перадаць яго на трацейскій суд. Італія не згаджалася. Нарэшце згадзілася на тое, што ваенныя аташэ вялікіх дзяржаваў пры пасольствах у Белградзе паедуць на сэрбска-албанскую граніцу і на месцы сцьвердзяць, ці маюцца якія — небудзь сьляды ваенных прыгатаўленьняў Юга-Славіі. Наагул выглядае дзіўна ўся гэтая камэдыя, калі для ўсяго сьвету ясна, хто сапраўды ўваружаецца і больш усіх пагражае міру. Есьць гэткія дзяржавы, якія, карыстаючыся падтрыманьнем вялікіх дзяржаваў, ці тым, што цяпер Эўропа ня можа пазволіць сабе гэтакай прыемнасьці, як вайна, гатовы ўсё захапіць, што толькі нядобра ляжыць. Вядома, што італьянскі фашызм на чале з Муссаліні толькі тое і ведае, што ўваружаецца без канца, што ў фашыстаўскай Італіі даўно рукі сьвярбяць. Скора забыла, як яе білі туркі ў Афрыцы, абісынцы і ледзь не расьціснулі немцы ў мінуўшую вайну. Даволі ўказаць на матэрыяльныя магчымасьці Юга-Славіі ў параўнаньні з Італіяй, каб вывясьці на чыстую ваду італьянскую фальш. Ці можа 12 мільённая Юга-Славія пагражаць 40 мільённай Італіі, уваружанай з ног да галавы. Праўда, Юга-Славія прыступіла ў 1925 г. к павялічэньню і рэарганізацыі сваей арміі. Павялічана лічба пяхотных дывізіяў з 16 да 20. На выпад к мабілізацыі прадбачыцца павялічэньне ліку дывізіяў да 40 у першую лінію і 10 у другую. На выпадак вайны Юга-Славія можа ў канцы першага месяца з пачатку мабілізацыі выставіць 1,200,000 жаўнераў і ў працягу 4 месяцаў яшчэ 300,000, складаючых 10 другіх дывізіяў. Італія цяпер мае 30 дывізіяў пяхоты і ў выпадку вайны можа павялічыць іх на 60 новых. Апрача гэтага італьянская армія лепш забясьпеч на матэрыяльна. Юга Славія мае 250,000 стрэльбаў, 1500 кулямётаў і 427 палявых гармат, а Італія — 268,000 стрэльбаў, 1,818 кулямётаў і 1,324 гарматаў. Затым Італія мае моцны марскі флёт і займае другое мейсца пасьля Францыі на сьвеце па сіле паветранага флёта. Нават Злучаныя Штаты займаюць толькі трэцьцяе месца, а Англія 4. На гэта год выдаткі на паветраны флёт Італіі аблічаны на 600 мільёнаў ліраў і лічба паветраных эскадраў дасягне 182, якія абслужываюцца 2,310 афіцэрамі і 24,000 радавымі. Адсюль пытаньне: для чаго і проці каго яна ўваружаецца? Можа заляжаўся порах і гарматныя снарады, на якія трацяцца вялізарныя грашовыя сумы, дык Італія і шукае новага повада да якой-небудзь авантуры, каб асьвяжыць ваенны матэрыял і зьнішчыць трохі людзкі матэрыял, з якім неяк ня можа справіцца. Ні ў Албаніі і ні ў Белградзе трэба шукаць прычыны балканскага канфлікту, а ў Рыме, які сам лезе на ражон.

N.

Чэрвякоу



Старшыня саўнаркому Савецкае Беларусі.

Падзеі у Кітаі.

Аканчальна апанаваны кантонцамі Шанхай і Нанкін. У апошнім былі дакананы напады на чужаземныя канцэсіі — прычым некалькі дзесяткаў чужаземцаў, найбольш англічан, згінула, ды паранена каля 100 чалавек. Сярод забітых знаходзяцца: др. Вільямс — рэктар Унівэрсытэту ў Нанкіне, др. Губэрт, два езуіцкіх манаха і некалькі матросаў з крэйсэра „Эсмэральда" і японскага тарпэдоўца. Ні адзін дом належучы да чужаземцаў — не пакінуты цэлым. Толькі пад прыкрыцьцем гармат з караблёў усім эўрапэйцам удалася пакінуць горад.

Нешта падобнае шыкуецца і ў Шанхаі, бо агульны прафэсыянальны саюз работнікаў пастанавіў зьнішчыць барыкады—аддзяляючыя міжнародную канцэсію, у якой схаваліся ўсе чужаземцы і якая знаходзіцца пад абаронай эўрапэйскіх жаўнераў, ад кітайскае тэрыторыі. Шыкуецца масавая атака на ўспомненыя барыкады.

Кантонскае-ж войска распачало марш на Пэкін. Трэба лічыцца з магчымасьцю хуткага заняцьця Пэкіну.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ЗАЧЫНЕНЬНЕ СЭСІІ СОЙМУ і СЭНАТУ. 25 сакавіка адбылося паседжаньне ў Бэльвэдэры Рады Кабінэтнай пад правадырствам Пана Прэзыдэнта Рэспублікі з удзелам усіх сябраў ураду.

На гэтым паседжаньні прэм'ер марш. Пілсудскі прачытаў прапазыцыю ўраду ў справе зачыненьня сэсіі Сойму і Сэнату ў дзень 25 сакавіка.

Пан Прэзыдэнт прыхіліўся да гэтай прапазыцыі і падпісаў адноснае распараджэньне.

Па вычарпаньню парадку дня ў Сойме 25 сакавіка, в. прэм'ер Бартэль прачытаў з трыбуны дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі — зачыняючый сэсію.

Чарговая сэсія будзе склікана ў канцы красавіка, або ў траўні.

РАСКОЛ У СОЙМАВЫМ КЛЮБЕ N. P. Ch. Паслы Н. П. Х. Бон, Шакун і Шапель прыслалі да рэдакцыі „Epoka" камунікат, у якім лічаць прызнаньне ўрадам Н. П. Х. партыяй нелегальнай бязпраўем".

Аднак далей гэтыя паслы пішуць: Разумеем, што палітычная лінія, на якой ад даўжэйшага часу пасовывалася, процў нашага праканаьня Незалежная Партыя Хлопская, была нявыразнай і фальшывай. Гэтае і прычынілася да рашэньня ўраду—абвесьціць гэтую партыю нелегальнай.

Нашае грамадзкае сумленьне не пазваляе нам у сучасных варунках найбеднейшыя сялянскія масы, якія нам вераць, пхаць на шлях палітычнай працы ў нелегальных варунках. Не маем найменшага маральнага права, каб быць прычынай масавых арыштаў і трыманьня людзей у турмах.

Дзеля гэтага з мэтадамі палітычнай працы ужыванымі паслом Ваяводзкім і яго прыхільнікамі—ня можам пагадзіцца і апушчаем Рады Н. П. Х".

Рыба пачала гніць ня зьнізу, але ад галавы — як і фактычна павінна быць.

ПОЛЬСКА-ПЭРСІДСКІ ТРАКТАТ. 19 сакавіка падпісаны ў Тэгэране трактаты: прыязьні і гандлёвы паміж Польшчай і Пэрсіяй. Перагаворы аб гэтых трактатах распачаліся ў Варшаве ў 1925 годзе ў часе пабыту пэрсідскага пасла Асад—Кана, далей вяліся за пасярэдніцтвам польскага пасольства ў Тэгэране. Трактат прыязьні абапёрты на асновах антыкапітуляцыйных і абсолютнай роўнасьці і ўзаемнасьці. Трактат гандлёвы рэгулюючы справы гаспадарчай замены паміж абодвымі краямі, адкрывае для польскага промысла шырокае поле збыту, асабліва для тавараў прадзільных, сельска-гаспадарчых машын і інш. Польскія вырабы, экспартаваныя да Пэрсіі будуць карыстацца найвялікшымі прывілегіямі.

Абодва трактаты ёсьць першымі такога роду ўмовамі, якія Пэрсія падпісывае з эўрапэйскай дзяржавай.

СПРАВА БЕЛАРУСКАГА ПАСЛА БАРАНА. Соймавая камісія пасольскае нятыкальнасьці разглядала прапазыцыю Нар. Нац. Саюзу (эндэкі) аб тым, как прызнаць мандат беларускага пасла Барана няважным дзеля наступнага: Яшчэ перад атрыманьнем пасольскага мандату Баран быў засуджаны на 6 гадоў вастрогу за дзяржаўную здраду.

Прабыўшы ў турме 4 гады Баран быў выпушчаны на волю, бо быў звольнены ад рэшты кары прэзыдэнтам рэспублікі. Пакінуўшы турму Баран зьявіўся да Сойму, — як пасол. Артыкулы К. К. на аснове якіх Баран быў засуджаны, заключаюць у сабе роўным чынам і пазбаўленьне пасольскага мандату. Дзеля гэтага Нар. Нац. Саюз унёс прапазыцыю, каб пазбавіць пасла Барана пасольскага мандату. Дэпутат Шрайбэр (жыд. кола) ўнёс прапазыцыю адлажыць прыняцьце аканчальнага рашэньня да атрыманьняпісьма аб перадчасным звальненьні пасла Барана.

Камісія прыняла прапазыцыю пасла Шрайбэра.

ШПІОНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ў ВАРШАВЕ. Паліцыйная ўлада зрабіла апошнім часам шмат рэвізіяў у комуністычных колах Варшавы, што прывяло да выкрыцьця прыгатаваньняў, якія комуністы рабілі ка дню 1 мая. Падчас рэвізіі знойдзена шмат камправітуючага матэрыялу, як нелегальныя друкі, інструкцыі, аружжа і выбуховыя матэрыялы.

Знойдзеныя дакументы ў гэнэральным сэкрэтарыяце Ц. К. К. П. П. сцьверджаюць вельмі бліскі кантакт з Грамадой і Незалежнай Партыяй Хлопскай.

У сувязі з усім тым арыштавана 50 асоб, сярод якіх ёсьць паважная лічба „тузоў" комуністычных. Большасьць арыштаваных — жыды.

ЛІКВІДАЦЫЯ ШКОЛЬНАГА КУРАТОРЫУМА ў ВЕЛАСТОКУ. Школьная ўлада прыступіла да ліквідацыі Школьнага Кураторыума ў Беластоку. Некаторыя паветы гэтага вокруга прыдзелены да Кураторыума Віленскага, іншыя будуць прылучаны да Кураторыума Варшаўскага.

За граніцай.

КАБЕТЫ НЯ БУДУЦЬ МЕЦЬ ПРАВА ВЫБАРНАГА ГОЛАСУ ў ФРАНЦЫІ. Камісія парляманту адкінула 7 галасамі проці 5 прапазыцыю, якая дамагаецца прызнаньня кабетам чыннага і пасыўнага выбарнага права.

Ядвігін Ш.

Што сказаў певень.

(Казка).

Упрошлым нумары „Беларускага Слова" мы далі агляд творчасьці Ядвігіна Ш. Цяпер друкуем адзін з ягоных твораў.

Жыў быў на сьвеце такі чалавек, каторы разумеў усю гутарку ці то скаціны — зьвяр'я, ці птушак Божых; ці як лес шуміць, ці трава шапаціць. Толькі нельга яму было прызнацца да гэтага: скажа каму, — самаму паміраць трэба. Меў гэты чалавек жонку, і жылі яны паміж сабой складна. Гаспадарку мелі не вялікую: асла і быка. Асёл стаяў у хлеві і авёс жраў, на быку гаспадар вазіў дровы і карміў яго саломай.

Вось, аднаго разу прывёз гаспадар гальля з лесу, адпрог вала і пусьціў у хлеў; не пасьпеў яшчэ і варот прычыніць,—чуе, стаў вол жаліцца аслу: паганае маё жыцьцё, братка асёл, пашанасьці і ўвагі ніякай ня маю ад свайго гаспадара: араць — ты, Рабы, ідзі; вады прыцягнуць — запрагай Рабога; дроў прывезьці — зноў Рабы ў атвеці. Усё як Рабы, дык Рабы: каму пугай па баку? — Рабому; каму яда — салома? — Рабому. А вось ты, асёл, стаіш, нічога ня робіш, а сена ды авёс толькі глуміш!" Разжаліўся асёл над доляй Рабога; стаў ківаць ён сваей вялікай галавой, каб прыдумаць якую раду для вала. З вялікай натугі свайго асьлячага розуму застрыг доўгімі вушамі дый апусьціўшы ісподнюю лупу, зашаптаў: „ты, вол, захварэй, дык гаспадар і да работы цябе ня возьме, і карміць лепш пачне".

Пачуўшы гэта, гаспадар вярнуўся ў хату, ды сьмяецца сабе. „Чаго сьмяешся?" — пытае жонка. — „От, так сабе сьмяюся", — адказаў мужык.

Назаўтрае, даў Бог дзень, пайшоў гаспадар у хлеў. Глядзіць: вол, адкінуўшы хвост і галаву ляжыць на баку, дый паглядае с-пад вока на гаспадара, што будзе? Гаспадар быццам нічога няведаючы аб хітрыках Рабога, закінуў яму сена, усыпаў аўса і, прыйшоўшы ў хату сьмяецца. Жонка ізноў давай прыставаць да яго: „чаго шчырышся? мо з мяне чаго? Кажы праўду!" Мужык і кажа: „не магу я табе праўды сказаць, чаго сьмяюся, бо тагды сьмерць мая прышла-б па мяне". На другі дзень ідуць гаспадар з гаспадыняй быка даведацца: ляжыць Рабы, хоць сена і авёс дачыста спытлеваў, толькі на другі бок перавярнуўся. Гаспадар і кажа да жонкі: „німа рады: зарэжам быка, бо страта будзе вялікая, а так, то хоць што колечы выручым".—Пачакай да заўтрага, кажа жонка, калі не паправіцца — рэж". Выйшлі яны з хлева, жонка пайшла ў хату, а мужык стаў пад варотамі слухаць, якая будзе нарада паміж яго жывёлай. Ажно бык і кажа аслу: „дрэнную ты асёл раду мне прыдумаў; што-ж мне без пары пад нажом гінуць? Цяпер парадзь братка як з бяды выкруціцца?" — Думаў, думаў асёл—нічога".— Німа, кажа ён, іншае рады: папраўляйся бык! Глядзі, каб заўтра ты быў ужо здароў, бо гэтыя жарты дрэнна могуць скончыцца, з цябе скуру злупяць, а мяне ў хамут на тваё мейсца ўшчэмяць!"

Чуўшы гэта, прыйшоў мужык у хату, дый сьмяецца: „заўтра наш Рабы здароў ўжо будзе!"—„А ты скуль ведаеш? Чаго вышчырыўся? Кажы! — крычыць, тупаючы нагамі, жонка. Зара мне кажы! Ты хіба нешта пра мяне ведаеш, што абы ў хату, дык сьмеешся. Ну?!" — „Сьмерці маей ты, кабета, хочаш, ці што? — адказывае мужык. Гаварыў я табе, што калі прызнаюся перад табой, чаго я сьмяюся, дык у той час паміраць мне прыйдзецца".

На другі дзень прыходзіць гаспадар у хлеў, ажно бык ужо стаіць, ды скоса ўсё паглядае на яго рукі ці не прынёс нажа з сабой; але гаспадар — нічога; адчыніўшы хлеў, выпусьціў вала да вады, і сам за ім ідзе. Рабы, каб паказацца перад гаспадаром, што ён саўсім ужо здароў, паставіўшы хвост да гары, як дуду, давай выбрыківаць, як мага, заднімі нагамі, а сам з боку пагладае, ці добра бачыць гэтыя штукі яго гаспадар. Але мужык напаіўшы загнаў яго ў хлеў, вярнуўся ў хату, дый сьмяецца сабе. Як угледзіла ізноў яго сьмех гаспадыня, калі ўзьелася яна, калі не пачне яго лаяць: „здохні ты, кажа лепей, а скажы прычыну твайго сьмеху! Вытрываць больш не магу!" Зазлаваў і мужык: „ну, кажа, калі табе ня шкода мяне, хай ты пропадам пропадзі! Даставай з кубла сьмяротную адзежыну,—скажу ўжо ўсю праўду, хоць сам памру!" Кінулася з радасьці жонка да кубла, выцягнула сьмяротную адзежыну, а сама ажно ўстаяць на мейсцы з цікаўнасьці ня можа. Гаспадар, уздыхнуўшы, стаў памалу рыхтавацца на сьмерць. Скінуўшы вопратку, памыўся, надзеў сьмяротную кашулю... толькі чуе гэта ён, як сабака, што ляжаў пад сталом, пачаў плакаць і кажа да пеўня, каторы хадыром хадзіў па хаце каля перапялёсьценькіх курыц: „ах, певень, певень! Як табе ня сорам? Гаспадар уміраць рыхтуецца, а табе вунь што ў галаве!" А певень пад'ехаўшы на адным крыле, калі зараве: „дурны гаспадар! Я маю дзевяць жонак, дый ліха мяне ня бярэ, а ён праз адну памірае!" Пачуўшы гэту гутарку пеўня, сьціснулася сьпярша з жалю сэрца гаспадара, а пасьля такая падпала злосьць на жонку, што доўга не чакаўшы, схапіў ён пугу, дык калі стаў сьцебаць сваю гаспадыню пугаўём, што тая з болю ажно занямела.

І спужаўся, і шкада зрабілася мужыку жонкі сваей, усьцягнуў ён яе на ложка, накрыў, а сам пабег па зельле да баб. Назаўтра, каб барджэй жонка моцы набралася, зарэзаў і сьпёк для яе пеўня. Ачуняла ў скорасьці гаспадыня, але больш ужо ня лезла ў вочы свайму мужыку, і зноў сталі яны жыць паміж сабой складна.

Са Зборніка „Васількі".

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Эканамічная сытуацыя.

Хаця забастоўка ткацкіх фабрык закончылася, дзякуючы інтэрвэнцыі Ураду і апамятаньню працоўных, але яна паказала, што ў нашым эканамічным жыцьці ня ўсё абстаіць у добрым стане. Пратэст 150,000 работнікаў з агульнай лічбы 700,000 польскіх работнікаў, з якіх 256,000 безработных, павінен паслужыць перасьцярогай для грамадзянства і асабліва ўраду, што калі ня будуць ухілены прычыны закончыўшайся забастоўкі, дык у хуткім часе можна чакаць паўтарэньня яе ў больш грозных разьмерах. А астаноўка працы ў якой-небудзь галіне прамысловасьці хоць на адзін дзень не палепшае цяжкіх варункаў агульнага эканамічнага жыцьця, а наадварот — толькі пагаршае.

Што-ж прымусіла 150,000 армію работнікаў кінуць варштаты працы і выступіць з жаданьнем 25 прац. прыбаўкі заработнай платы? Ці справядлівы іх жаданьні.

На гэта дадуць адказ наступныя лічбы. Польшча належыць да дзяржаваў з надзвычай малымі зьберажэньнямі, высокім працэнтам крэдыта, адносна высокімі цэнамі на фабрычныя вытвары і вельмі танаю платаю працоўных. Калі падала марка, дык адначасна расла і плата. А калі ў першай палове 1925 г. устабілізавалася валюта, дык павялічэньне платы застанавілася, хаця ўзрост цэнаў ішоў далей. У параўнаньні з першай паловай 1925 г. плата работнікаў, вылічаная ў золаце, цяпер ніжэйшая ўва ўсіх галінах прамысловасьці і ўва ўсіх цэнтрах прамысловых. У сьнежні 1926 г. работнік будаўляны ў Варшаве, Лодзі і Кракаве атрымліваў намінальна ў злотых столькі, сколькі ў 1925 г. Лодзінскі ткач атрымліваў на 17 прац. больш, чым у пачатку 1925 г. Мэталёвец у Варшаве — 30 прац., Лодзі — 10 прац., Пазнані—15—23 на прац. і Г. Шлёнску—22—27 прац. больш, чым у 1925 г. Найбольш паднялася плата вуглякопаў і гутнікаў Г. Шлёнска—40—45 прац. У гэты час вартасьць злотага панізілася на 17 прац, а цэны на прадукты і тавары узрасьлі на 42 прац.

Ткач хлапчата — паперовы (пэркаль) у I палове 1925 г. атрымліваў 5,72 злотага, а цяпер—6,73 зл. у дзень. Прадзільшчык хл. паперовы — 6,17 (1925 г.) — 7,26 (1926 г.). Ткачыха кабета 3,68 зл. (1925 г.) 4,33 зл. цяпер. Плата работніка валакніст й прамысловасьці ў Лодзі ўзрасла за паўтара года на 17,5 прац., а цэны за гэты пэрыяд — на 39 прац. У 1914 г. падзённая плата ткача складала 5,32 зл., прадзільшчыка—4,92 зл. і прадзільшчыцы — 2,66 зл. Ці плата цяпер у параўнаньні з 1914 г. узрасла: ткача на 26 прац, прадзільшчыка —46 прац. і прадзільшчыцы—63 прац. А вартасьць утрыманьня за гэты час узрасла на 101 прац. Гэта лепш усяго можна спраўдзіць па цане хлеба. Перад вайною, у 1914 г. 1 кілаграм жытняга хлеба каштаваў ў Варшаве 29 грошаў, у студню 1924 г.—40 гр., 1925 г. — 48 гр., 1926 г. 47 гр. і 1927 г. — 66 г. I ў той час, як муляр, атрымліваючы у 1924 г. у Варшаве 80 гр. за гадзіну працы мог купіць за гэтыя грошы 2 і тры чацьвертых кілаграма хлеба, у 1924—27 г., атрымліваючы 1 зл. 8 гр., можа купіць толькі 1 з паловай кіл хл. А трэба заўважыць, што хлеб адносіцца ў нас да самых танных артыкулаў.

Мінімум пражыцьця ў нас акрэсьляецца рожнымі эканамістамі рожна. Гэта лічба вагаецца між 7—10 зл. ў дзень на адну асобу з сямьёю. Як мы бачылі, ні адзін з тых работнікаў, якія баставалі, не атрымліваюць гэтага мінімума. Główny Urząd Statystyczny акрэсьляе ў наступнай чарзе заработак нашых работнікаў, прыняўшы мінімум пражыцьця за 100: мэталіст фаховы—59, горнік у Дамброве—72, Ткач у Лодзі—60. У параўнаньні з заработнаю платаю работнікаў за граніцаю наш работнік атрымлівае значна менш. Гэтак у Швэцыі звычайны ткацкі работнік атрымлівае за тыдзень работы 11,76 даляраў, у Англіі—10 дал., у Нямеччыне — 7,58 дал., і ў Польшчы—4,87 дал. Прыняўшы за 100 плату варшаўскага работніка ў 1914 г., атрымаем наступны прыраўнаваўчы уравень платы: Варшаўскі работнік — 70, работнік Парыжа — 117, Бэрліна — 182, Вены—149 і Лёндана—287.

Гэтакі адносна нізкі ўравень заработнай платы польскага работніка павінен быў бы аблягчыць канкурэнцыю польскіх фабрычных тавараў на заграпічным рынку і карысна адбівацца на нашым гандлёвым балянсе і наагул гаспадарчай сытуацыі. Але на жаль мы гэтага ня бачым. Прычынаю гэтаму іншыя перашкоды, як адсутнасьць і высокая дарагоўля ўнутранага крэдыта, высокія падаткі, дарагоўля сыр'я, старыя машыны на фабрыках і горшы, чым за граніцаю, гатунак нашых тавараў і г. д. Толькі ў мінуўшым годзе гандлёвы балянс крыху паправіўся дзякуючы забастоўцы англійскіх вуглякопаў і вывазу нашага вугля і жалеза за граніцу. Але з канцом англійскай забастоўкі наш гандлёвы балянс горшае з кожным днём. Рэкордная лічбы гандлёвага сальдо, ці перавышэньня вывазу заграніцу над увозам у край, дасягнута ў студні 1926 г.—61,9 міл. зл. Але ў першым выпадку гэта дасягнута была галоўным чынам абмежаваньнем ці забаронаю ўвоза з-за граніцы. Лепш усяго сьведчыць аб гэтым наступны шэраг лічб за 12 месяцаў мінуўшага года, з якіх першыя азначаюць прывоз, другія—вываз і трэція—сальдо ў міл. зл.: студзень—47,3—109,2+61,9 зл., люты—47,8—90,7 + 42,9 зл., сакавік — 72,9—88,2+15,3 зл., красавік—68,2—93,8+25,6 зл, травень — 52,2 — 89,6+37,4, чэрвень — 63,4 — 102,0 + 36,6 зл., ліпень — 65,8—120,9+55,1 зл. (самы разгар англійскай забастоўкі), жнівень—92,1—128,6+36,5 зл., верасень—85,4 - 114,7 + 29,3 злотых, кастрычнік — 102,2—117,9 + 15,9 + 15,7 зл., лістапад — 108—131,7 + 23,7 зл, сьнежань—90,9—118,7+27,8 міл. зл. Але ў бягучым годзе сальдо раптоўна пачынае падаць. Гэтак у студні была вывезена на 114,8 міл. зл., сальдо 7 міл. зл., вываз—116,4 міл. зл., сальдо 4,4 міл. зл. Тлумачыцца гэта зьменшаньнем вывазу вугля, здабыча якога падае з кожным днём. У верасьні мінуўшага года было вывезена вугля заграніцу 2,134,611 тонаў, у лістападзе—1544,000 т., у сьнежню — 1,298,000 т., у студню 1927 г. — 1,164,000 т. і ў лютым толькі - 881,000 тонаў. Галоўную масу польскага вываза складае сыр'ё. Яшчэ ў 1925 г. вываз валакністых тавараў з Польшчы складаў 22 прац. агульнай сумы вываза, а ў 1926 г. толькі 13 прац.

Каб скончыць з глаўнейшымі праявамі эканамічнага крызісу, выклікаўшага забастоўку лодзінскіх працоўных, трэба яшчэ ўказаць на ўзрост безработнцьця ў Польшчы, якая да гэтай пары не была вельмі заметна дзякуючы масавай эміграцыі безработных за граніцу. Пасьля вайны выехала заграніцу больш мільёна безработных Цяпер на 700,000 усіх работнікаў у Польшчы прыходзіцца каля 256 000 зарэгістраваных безработных. Праўда і заграніцаю шмат безработных, гэтак у Англіі 1,630,000, Нямеччыне—1,370,000, Аўстрыі—179,000, Італіі—150,000. Але ў нас найбольшы працант безработных. У той час, як у Англіі прыходзілася ў канцы 1926 г. на 100 работнікаў 13 безработных, у Нямеччыне — 14, у Чэха-Славакіі—4, у Польшчы—27 безработных на 100. А цяпер гэты працант яшчэ больш.

S.

Біржа.

Даляры	8, 94—8, 90 зл.
Залаты рубель	4, 73—4, 74 зл.
Сярэбраны рубель	2, 75 зл.
Чырвонец	33, 75 зл.

Збожжа

(Варшава)

Жыта (100 кілагр.)	— 41, — зл.
Пшаніца „ „	56 зл.
Ячмень брав.	40 — 25 зл.
Авёс „ „	37, — — зл.

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	42 — 44 зл.
Авёс „	39 — 41 зл.
Пшаніца „ „	50 — 51 зл.
Ячмень браваровы	39 — 42 зл.

Катастрофа у Японіі.

Страшлівы образ зьнішчэньня места Кітага.



Тутэйшая хроніка.

Імяніны марш. Пілсудскага. Вільня ўрачыста сьвяткавала 19 сакавіка дзень імянін галавы сучаснага ураду марш. Пілсудскага.

Адбыліся вайсковы парад урачыстая акадэмія ў Унівэрсытэце, парадное прадстаўленьне ў „Рэдуце" і ўвечары раут, з'арганізаваны віленскім „Стральцом".

Беларускай Нацыянальнай Радай выслана марш. Пілсудскаму павіншавальная дэпэша.

Арышт бандыта. Ня так даўно недалёк ад Вільні быў зроблены агідны бандыцкі напад на сям'ю Маслоўскіх, прычым бандыт карыстаўся сякерай. Апошнімі днямі паліцыі ўдалося выкрыць, хто быў спраўцам нападу на Маслоўскіх. Арыштаваны жыхар в. Бухты Станіслаў Азюлевіч—якога абвінавачваюць у гэтым.

9-ыя ўгодкі Незалежнасьці Беларусі. 25 сакавіка ўсе без вынятку беларускія групы сьвяткавалі угодкі Незалежнасьці Беларусі.

Беларускай Нацыянальнай Радай разам з Беларускай Хаткай быў наладжаны банкет, які адбыўся ў салі „Заціша", а гадзіне 4 па паўдні. Банкет адбыўся ў надзвычай сымпатычнай сямейнай беларускай абстаноўцы. Банкет скончыўся беларускімі сьпевамі і скокамі.

Паважаны Пане Старшыня!

Я ніжэй падпісаны Браніслаў Гузоўскі, пераканаўшыся ў тым, што Грамада зьяўляецца партыяй комуністычнай—выходжу з ее

Гузоўскі Браніслаў.

в. Медвінавічы, Слонімскага пав,

20 сакавіка, 1927 г.

Паважаны Пане Старшыня!

Я—Лішык Аляксандар, жыхар в. Драбавічы Слонімскага пав. выходжу з ліку сябраў Б С Р. Грамады.

Зрабіў я гэта дзеля таго, што сапраўды гэтая партыя аказалася не беларускай а комуністычнай.

Партыйны білет № 3277 далучаю да гэтага.

Лішык Аляксандар.

в. Драбавічы Слонімск. пав.

19 сакавіка, 1927 г.

РАТЫФІКАЦЫЯ БЭСАРАБСКАГА ТРАКТАТУ ЯПОНІЯЙ. Надыходзяць весткі з Токіо, што японскі ўрад прыгатоў[illegible] да ратыфікацыі трактату, датычачага Бэсарабіі.

КРЫВАВАЯ БОЙКА ПАМІЖ КОМУНІСТАМІ і ПАЛІЦЫЯЙ. 22 сакавіка дайшло да крывавае бойкі паміж бэрлінскаю паліцыяй і комуністамі.

Нямецкія комуністы зрабілі дэманстрацыйны паход на знак пратэсту проці нападу нямецкіх нацыяналістаў на комуністаў. Конная паліцыя хацела разагнаць гэты паход, які спыніў рух на адной з галоўных вуліц Бэрліна, а калі комуністы не хацелі разыйсьціся — ужыла аружжа.

Адзін дэманстрант забіты а каля 30 ранена. Ранена таксама некалькі паліцыянтаў.

НАПАД ПАЎСТАНЦАЎ НА ЦЯГНІК. Каля 200 мэксыканскіх паўстанцаў зрабіла раптоўна напад на цягнік, які баранілі 50 жаўнераў, каля Гіямата. Жаўнеры пасьля кароткай перастрэлкі здаліся, пасьля чаго паўстанцы ўварваліся да цягніка. Некалькі пасажыраў, якія прабавалі бараніцца—былі забіты або ранены.

АМЭРЫКА і ПАДЗЕІ Ў КІТАІ. Тры амэрыканскіх кананеркі атрымалі загад зараз-жа скіравацца да Шанхаю.

БЭЛЬГІЯ НАПЯРЭДАДНІ КРЫЗІСУ. Па весткам з Парыжу ў бліжэйшай будучыне трэба чакаць урадовага крызіса ў Бэльгіі. Тлумачыцца гэта тым, што сацыялісты адмаўляюцца ад далейшых уступак, што няўхільна пацягне за сабой урадовы крызіс. Буржуазныя партыі ў сваю чаргу нічога ня робяць для ўхіленьня крызісу.

ЛІКВІДАЦЫЯ КАНФЛІКТУ НА БАЛКАНАХ. З Белграда тэлеграфуюць, што юга-славянскі ўрад аканчальна прыняў англійска-францускую прапазыку, даручыць ваенным экспэртам Англіі, Францыі і Нямеччыны супольна з паўнамоцнымі „наглядчыкамі" Італіі і Юга-Славіі — выясьніць палажэньне ў албана — юга славянскай пагранічнай зоне.

У С. С. Р. Р.

Павяенная азьвярэньне.

Харкаўская часопісь „Пралетар" падае ў N 24 м м яскравы выпадак пасваеннага азьвярэньня савецкае вёскі пад бальшавіцкаю апекай. Сумным гэроям зьяўляецца тут вясковы дзяцюк, якога яшчэ малым захапіла вайна і бальшавіцкі пераварот.

Дзіўна слухаць акт абвінавачаньня і глядзець на 18 гадовага хлапца Сухацеплага, які сядзіць на лаве падсудных сярод увaружанае варты

На абліччы падсуднага спакой. Як-бы ўсё—судзьдзі і голыя шаблі ёсьць штосьці такое, што яго зусім ня тычыцца. У голасе німа нэрвовасьці,—зусім лядовы спакой.

— У мінулым годзе, восеньню сабраліся ў в. Хухры, Ахтырскага раёну хлапцы і дзяўчаты на вечарыну—гуляць,—кажа Сухацёплый. Што там рабілася „не памятую"... Але пра гэтае кажуць сьведкі і акрываўлены нож, што ляжыць перад судом, як доказ рэчавы.

— Гулялі — прадаўжаюць далей сьведчыць іншыя. А ён выцягнуў нож і пачаў хваліцца:

— Каго-б мне зарэзаць? Падыйшоў да Давідэнка.

— Хочаш, зарэжу? Хочаш?

— Ды адыйдзі! — лёгка штурхануў яго Давідэнка.

— Хочаш? — ізноў запытаў Сухацёплы.

— Ну, рэж — жартуючы адказаў Давідэнка і ў тую-ж хвілю паваліўся на падлогу з сьмяротнай ранай у грудзёх...

— Вады! — толькі прастагнаў ён і памёр.

— За што забіў?—ня ведаю — былі таварышамі, неяк мёртва-халодна адказвае суду забойца.

„Дэгэнэратыўны псыхапат"—сцьверджае судовая экспэртыза.

— Адзін быў у мяне сын, — кажа прыгнечана суду бацька Сухацёплага.

— Былі ў яго і раней „нажавыя" выпадкі. „Судзіце яго за ўсё ўжо разам"—канчае няшчасны дзед.

Акружны суд засудзіў на 4 гады турмы.

„Новый Час".

Зачыненьне Ісаакіеўскага Сабору.

Па распараджэньню Петраградзкага Савету Ісаакіеўскі Сабор (гл. фатаграфію ў № 6 „Беларускага Слова") зачынены для багаслужэньняў. У Саборы будзе зроблены царкоўны музэй.

Арышты украінцаў.

У Кіеве арыштавана 60 украінцаў—абвінавачаных у самасьційніцтве (незалежнікі). Сярод арыштаваных ёсьць рад асобаў, належачых да групы праф. Грушэўскага. Арышты знаходзяцца ў сувязі з пастановай цэнтральнага камітэту комуністычнай партыі Украіны аб рашучай барацьбе з самасьційнікамі. Некаторыя вайсковыя часьці, у якіх асабліва моцным было імкненьне да незалежнасьці, расфарміраваны — жаўнеры адпраўлены да цэнтральнае Расеі.

Кідаюць Грамаду.

На імя Старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады п Паўлюкевіча паступілі гэткія заявы:

Паважаны Пане Старшыня.

Далучаючы да гэтага партыйныя грамадаўскія білеты за №№ 809 і 16027, просім надрукаваць у „Беларускім Слове" наступнае:

Пераканаўшыся ў тым, што Б. С. Р. Грамада ёсьць партыя антыдзяржаўная і комуністычная — мы з комунізмам нічога супольнага ня маючы, выходзім з гэтае партыі.

Адначасна просім залічыць нас у лік сябраў культурна-прасьветнага Т-ва „Прасьвета".

Ерш Ігнат
Янка Саўка

в. Скіпаравічы, Слонімскага пав.

19 сакавіка, 1927 г.

Паважаны Пане Старшыня!

Гэтым падаем да агульнага ведама, што выходзім з ліку сябраў Б.С.Р. Грамады, бо гэтая партыя аказалася не беларускай, а комуністычнай.

Адначасна просім залічыць нас у лік сябраў Беларускага Т-ва „Прасьвета".

Партыйныя білеты далучаем. (№№ 44825, 44809, 44815, 6175, 6180, 72065).

Стаськевіч Янка (II), Арцыман Аляксандар (I), Шурпа Кастусь, Шурпа Аляксандар, Арцыман Лявон (IV), Саўка Максім (II).

в. Савалёўка, Жыдамлянскае гм. Горадзен. п.

17 сакавіка, 1927 г.

Паважаны Пане Старшыня!

Прашу надрукаваць у „Беларускім Слове" наступнае: Я — жыхар в. Шчырбовічы, Баранавіцкага пав. да дня 13 лютага лічыўся сябрам Грамады. Выступіў я з Грамады — бо пераканаўся, што гэтая партыя ёсьць комуністычная, з якім я нічога супольнага мець не хацеў.

Язэп Шут.

в. Шчарбовічы, 20 сакавіка 1927 г.

Ад рэдакцыі.

Дзеля таго, што Грамада аканчальна зьліквідавана уладай і аб'яўлена нелегальнай,—больш зьмяшчаць пісьмаў б. грамадаўцаў мы ня будзем.

Жыцьце провінцыі.

Пара і нам прачнуцца.

(Пісьмо ад беларускага вучыцеля з Дэрэчынскае гм. Слонімскага пав.

Па розным куткам нашае Бацькаўшчыны маладыя інтэлігэнтныя сілы, якія раней стаялі на чале гэтак званых Гурткоў— прыходзяць да перакананьня, што той шлях, які яны выбралі для адшуканьня сваіх нацыянальна-палітычных правоў —шлях фальшывы. У гэтыя гурткі яны пашлі працаваць па двум прычынам. З аднаго боку агітацыя правадыроў Грамады, якія пазьней адыйшлі вельмі далёка ад сваіх мэтаў і сваёй праграмы. Гэтыя правадыры хаця і рахуюць сябе барацьбітамі за лепшую долю, шчасьце свайго народу, але сталі на фальшывы шлях. Усім нам ведама і не закрываючы вочаў, адкрыта можна сказаць, што кіравалі яны сваю палітыку аб далучэньні Зах. Беларусі да жыдоўскага царства. Мусіць горкі досьлед і цяжкі лёс нашых братоў Беларусаў, якія знаходзяцца за рубяжом у „Савецкім раю“, якія стогнуць ад камісарскага ярма іх зусім не абходзіць, ім не баляць тыя балячкі і раны... Правадыры гэнае „комуны“ хацелі і нашу Бацькаўшчыну разам з намі закабаліць і аддаць у рукі жыдоў і чэкістаў.

Рад агітатараў вельмі стараўся, каб як найбольш абаламуціць маладыя інтэлігэнтныя сілы і вербавалі іх на свой бок. А трэба зазначыць, што вясковая інтэлігэнцыя мае вялікі ўплыў сярод абездоленнага сярмяжнага, забітага як фізычна, так і духоўна нашага гаспадара Абецанка людзям зямлю без выкупу, падзел маёнткаў,—мелі вялікі ўплыў сярод сялянства. За гэтым лёзунгам і па сваей палітычнай несьвядомасьці многа пайшло за правадырамі гурткоў. Але скора пераканаліся, што ўсё гэта ёсьць ашуканства, баламуцва, пераканаліся, што правадыры Грамады і яе агэнты перасьледавалі свае асаістыя карысьці і пачалі адхіляцца з агідаю ад гэтае кампаніі. Калі чалавек топіцца, дык ён хапаецца за саломінку, каб адратаваць сваё жыцьцё. Гэта сталася і з нашым вучыцельствам — якое кіруе жыцьцём вёскі. Людзі аддаўшыя маладыя свае годы справе выхаваньня маладога пакаленьня, пасьвяціўшага сябе вучыцельству, выкінутыя лёсам за бар'ер, як непатрэбныя, апыніліся ў трагічных жыцьцёвых варунках. Гэга і скарыстала Грамада. Вучыцельства як ня меўшае выхаду пайшло на вудачку і стала на чале руху па вёсках. Тут трэба зазначыць, што Польскі Урад дапусьціў абмылку, бо каб раней зьвярнуў сваю ўвагу на вучыцельства беларускае, дык можна сказаць адкрыта і сьмела, што ні адзін з вясковых вучыцялёў не пайшоў бы да Грамады, і быў бы лёяльным грамадзянінам Дзяржавы, як і верным сынам сваёй Бацькаўшчыны. Дык браты,—пара падумаць над лёсам сваіх братоў, бацькаў, жонак, маткаў і дзетак, каб і іх не спаткаў такі лёс, у якім апыніліся нашыя зарубежныя браты Беларусы. Калі Вы лічыцеся праўдзівымі сынамі сваей Бацькаўшчыны, калі вы хочаце ёй шчасьця, лепшае будучыны, дык змыйце з сябе гэты бруд, гэту прапаганду, бо яна можа д весьці толькі да адных сьлёз, пракляцьця на Вас. Пакажыце сапраўдную сваю прыхільнасць да сваёй Бацькаўшчыны і будзьце праўдзівымі яе сынамі.

Мы ўсе павінны, як адзін, проціў комуністычнага руху аб'еднацца каля сваей праўдзівай нацыянальнай арганізацыі Беларускай Нацыянальнай Рады, якая стаіць на правільным шляху, якая ідзе леяльным шлякам да адваяваньня сваіх нацыянальных і палітычных правоў і гэтага здабудзе, калі будзе патрыманьне з боку грамадзянства. А грамадзянства ўжо пачынае патроху праціраць вочы і бачыць хто наш праўдзівы вораг, а хто прыхільнік, абаронца нашых правоў і шчыры барацьбіт за лепшую долю і шчасьце нашай Бацькаўшчыны. Бярэце прыклад з Дзятлаўскага зьезду Беларускай Нацыянальнай Рады, ініцыятарамі якога зьявяляліся быўшыя старшыні гурткоў і сябры гэтых гурткоў.

Хай добры прыклад Дзятлаўцаў паслужыць усім іншым.

Дык ў добры час пачнем і мы ў Слонімшчыне ачышчаць атмасфэру ад яду.

Вучыцель.

22 Ш. 1927 г.

Праца „Прасьветы“ ў Баранавічах.

Пры Баранавіцкім гуртку Т-ва „Прасьвэта“ з'арганізаваўся струнны аркестр пад кіраўніцтвам Васіля Сівака. Па усякім спраўкам зьвяртацпа да яго-ж. (Сашовая вул. № 158.)

Адчыненьне староства ў Маладэчыне.

Згодна з тэрмінам вызначаным у свой час Радай Міністраў, да дня 31 сакавіка будуць скончаны арганізацыйныя працы, зьвязаныя з утварэньнем маладэчанскага павету. А з 1 красавіка, замест урадуючай дагэтуль Экспазытуры Вялейскага Староства, будзе адчынена Маладэчанскае Староства з усімі правамі і дзейнасьцю іншых староставў.

Па прапазыцыі віленскага ваяводы кіраўніцтва Старостваw прыме дагэтуляшні кіраўнік Экспазытуры Староства Вялейскага Юры Сухорскі

Урачыстае адчыненьне Староства Маладэчанскага, а таксама прыняцьце і пасьвячэньне новага гмаху, вызначанага на зьмяшчэньне ўсіх павятовых урадаў, адбудзецца 12 красавіка б. г. у прысутнасьці віленскага ваяводы, уладаў II інстанцыі і прадстаўнікоў грамадзкіх установаў.

Слонімская хроніка.

М. Сяргей, старш. гуртка кепскай памяці Грамады ў в. Блізная Ружанскай гм. Косаўск. павету, як відаць цяпер, працаваў у комуністычным духе — пэўна, што не дарма.

У часе вобыску паліцыя знайшла комуністычныя адозвы, карэспандэнцы і .. аружжа!

Цяпер гэты таварыш сядзіць у Пружанскім вастрозе.

Жыхары вёскі Блізная, Ружанскай гм., Косаўск. пав., — надта дрэнна цяпер глядзяць на нейкага Антося Малашэвіча, быўш. бальшавіцкага камісара, які хацеў тутака завясьці... комуну.

Сам добры гультай, п'яніца, хоча „пераварату“,—каб добра грабіць можна было...

Ось, якіх людзей мела сьмярдзючая „Грамада“ са Сьмярдзяковым на чале!

Даводзім да ведама чэснага беларускага грамадзянства інш. паветаў, што паветра ад заразьлівай хваробы комуністычных гуртоў (ячэек!) ў Слонімшчыне ачышчаецца. Лік грамадаўскіх газэтаў паменшаецца. Хаця высылаюць дарма, мала хто імі цікавіцца. Раней на вёску прысылалі па 7—8 экзэмпл., а цяпер толькі 2.

Паводле „kart prenumeraty“ на пошту ў м. Слоніме раней высылалі тав. Луцкевічы і К-о 300 штук, цяпер 40, ў Бытэнь раней 126—цяпер 45, ў Дзярэчын—80, цяпер — 38, ў Езерніцу — 45, цяпер 22. — Сяляне добра зразумелі, што ўсякія чырвоныя „Н. Справы“, „Nar. Zwon“ — гэта ёсьць атрута для народа,—і выдаецца за грошы Г.П.У., – з той мэтай, каб зрабіць рэвалюцыю і гэтакім спосабам адсунуць увагу ад сваіх бальшавіцка-ўнутраных справаў, гдзе нездаволеныя сяляне проста варожа адносяцца да чырвоных тыранаў, якія ў 1918 г. абяцалі рай сялянам, а далі... і мора крыві..

Скампрамітаваныя Грамада — і шпікоўская N. P. Ch. трашчаць на цэлым фронце... „Правадыры агітатары„, якія раней добрыя грошы бралі за баламуцтва сялян-сярмяжнікаў, уцякаюць ад „Чырвонага нябошчыка“, які пачаў страшна сьмярдзець...

Апошнім часам зьвярнуўся з просьбай да Белар. Нац. Рады ў Вільні, якая ёсьць фактычна запраўдная прадстаўніца беларускага грамадзянства, афіцыяльны дзеяч Грамады з Міжэвіч, Слонімск. павету.

Маральны адпор у цяжкія часы — з боку адзінокіх прыхільнікаў і сябраў Б. Н. Рады — які быў даны грамадаўцам, — пачаў цяпер даваць рэзультаты!

24 III. г. г. на шосе Ружана-Слонім, каля вёскі Пасінічы, Міжэвіцкай гм., Слонімск. пав. платная банда чырвоных хуліганаў раскінула комуністычн. адозвы і вывесіла чырвоную шматку. Ведаючы тутэйш. варункі і абставіны палітычнага жыцьця, адкрыта трэба сказаць што гэта зрабілі толькі сябры „Падраённ. Камітэту Комуніст. П. З. Б.“ і за яе грошы (дарма ніхто працаваць ня будзе.) з вёскі Пасінічы —гдзе ёсьць некалькі чалавек, угалоўных і б. камісараў-чэкістаў, якія цяпер вядуць „працу“ ў комуніст. нампрамку з мэтай зьдзейсьненьня сваіх асабістых плянаў: садраць за „працу“ найбольш даляраў. Гэтыя „тыпы“ з пад знаку чырвонай зьвязды псуюць апінію гэтай вёскі, гдзе 90 прац. сялян, гэта спакойныя людзі.

Б. Старшыня „гуртка“, вёскі Вострава, Міжэвіцкай гм., Слонімск. пав., Тодар Мандрык, 24 III. 27 г. праз Акружны Суд у Горадні, на судовай сэсіі ў Слоніме засуджаны на 3 месяца турмы за ўгалоўны праступак. Пекныя кветкі мела нябошчыца Грамада ў сваіх „стройных і шчыльных“, на 25 прац. бандыцкіх шэрэнгах!“

Есьць на сьвеце рожныя характары людзеў, але такія як ў в. Селявічы, Слонімск. павету, мае нейкі Янка Быцько, напэўна нігдзе німа. За залатоўку зарэжа чалавека, за адну чарку сьмярдзюгі—будзе прысягаць, як захочаш у патрэбе, за цыгарку—пасьведчыць усё і ўсім. Гэта адзін тып, а другі Антось Акулевіч, вечны авантурыст і кандыдат на „вясковага адваката“. Апошні больш 120 справаў меў у сваім жыцьці і не адзін раз сядзеў у турмах яшчэ да вайны.

Гэтыя выродкі нашай вёскі толькі муціць любяць—і бальшавікоў чакаюць.. Калі-б хто з сялян меў гдзе цяжкую справу ў судзе і ня мог знайсьці сьведкі, можа напісаць паштовую карту да „Прафэсыянальнага сьведкі“, в. Селявічы, пошта Езёрніца.

Б. сэкрэтар агітатар Грамады ў в. Селявічы, Слонімск. пав. Янка Рэшка, пасьля выхада са Слонімскай турмы адхрэшчываецца ад сваёй Грамады і N. P. Ch.—дзеля таго, што „сябры“ ж захацелі сабраць паміж сабой грошаў на „выручку“ яго з „Белага гатэлю“... (Пакой № 4).

Малады, комуністычны хуліган павінен ведаць, што б. „сябры“ яго гуртка ніколі не дадуць грошаў на „выручкі“ грамадаўскіх шпікоў-агітатараў ад турмы, да якой трапіў за „працу“... Прайшоў той час, калі абаламучаныя сяляне б. гурткоўцы з в. Селявічы, верылі платным дурням. Цяпер інакш ёсьць тутака, што на сваей тоўстай скуры папрабаваў „сэкрэтар“ нядаўна! Аддай „сябрам“— грошы, якія сабраў са складак — а забірай сьмярдзючыя білеты тваей маці — Грамады. Аддай грошы людзям.

Савецкі гумар

На розных мовах.



На канфэрэнцыі для перавыбараў Шахтбюро ў Кадзіеўцы (Донбас) палова дэлэгатаў аказалася п'янымі.

— Таварышы, галасуйце яшчэ раз, — хто ўстрымаўся?
Голас — „Ніхто ня ўстрымаўся — ўсе выпілі сколькі трэба!

Пісьмо у Рэдакцыю

Паважаны Пане Рэдактар!

Вельмі прашу зьмясьціць ў Вашай паважанай газэце гэткую папраўку:

У „Беларускім Слове“ N 7, у справаздачы са зьезду Б Н.Р. у Дзятлаве напісана нібыта я сказаў, што ў в. Гнаінске, Раготнінскае гм працавала Незалежная Партыя Хлопская.

Дык сьцьвярджаю, што ў Гнаінскэ Незалежная Партыя Хлопская ніколі не працавала і цяпер не працуе.

З пашанай

Вінцук Данілчык.

в. Нагорнікі 20 сакавіка, 1927 г.

Ходзяць чуткі...

...што сябры „Еднасьці“ незадаволеныя заменаю сваім шэфам Вашэйлам аднэй літары на другую ў назове „арганізацыі“—перарабіліся на „Аб'еднаньне“ Аднак з увзгодам Цюфяка — Кабылкіна „Аб'еднаньне“ пераробленa на „Абжыраньне“...

..што праўдзівы сялянскі пасол Індык—Ерамеіч з мэтай вялікшай папулярнасьці зьмяняе буржуазную суконную вопратку на аўчыны (каракулёвыя!)...

..што задатак дадзены Вашэйлам на рахунак Горадзенскай „Еднасьці“ за новы дамочак пад № 7 на Антокалі — прапаў, бо клюбная антэрпрыза „Абжыраньня“ лопнула.

..што спэц бездарнік Макар Целятнікаў атрымаў прыз беларускіх хамелеонаў, абняўшы „неаб'ятнае“ праз прыняцьце адначасовага ўдзелу ў полёнофільскім Дню, грамадаўскай Маланцы і ў інтэрнацыянальнай Сахе.

Прызам зьяўляецца дыплём, на якім прыгожа выгравіраваны два цялячыя задкі з бойка паднятымі ў гару хвастамі...

Паштовая скрынка.

Тамаш Сьмех (*ці Г-ш Л-ык?*) Сьв. Пісаніе кажа „толцыте і отверзется вам“. Так і з вамі. Прызнаемся, што нарэшце Вы нас пераканалі. Бязумоўна Вашае апошняе пісьмо зьяўляецца шэдэўрам ліухоўнага стылю, а слоўцы „пякельнікі“, „падонкі хуліганскай натуры, „капусьцяныя галовы“, „пустыя бочкі ад сьпірту“, „чортавы душы“, „кароста“ і г. д. і г. д. ёсьць бязумоўна пекнымі кветкамі мэтадыстаўскае пропаведзі. Дзеля гэтага Вашае высокамэтадыстаўскае пісьмо выдрукуем цалком у асобнай брашурцы і разашлем па ўсіх кутках Беларусі,—для прапаганды мэтадызму.

Качан Аляксандар— здольнасьці Вы маеце' але пісаць вершы ня так лёгка. Трэба ведаць правілы вершаваньня, — каб была ня толькі рыфма, а быў бы захаваны разьмер. Радзім пісаць далей. Калі што падойдзе—зьмесьцім.

Я. Ж-ік— чакаем Вашага прыезду да Вільні.

Беларуская Калясьніца — Ты не беларуская калясьніца, а сьмярдзючая інтэрнацыянальная бочка—рароткія рукі маеш, каб дабрацца да правадыроў Беларускага Нацыянальнага Руху.

Шчэбет Тамаш— 2 злотых атрымана. Адказ на запытаньне высылаецца па пошце.

Моняк Максім — высылкі газэты ня спынім, калі будзеце прысылаць нам карэспандэнцыі. Па Вашаму пісьму відаць, што гэта рабіць Вы маглі-б.

Сушко Аляксандар — газэту будзем высылаць, калі будзеце прысылаць карэспандэнцыі.

Тарасаў Янка— за шмат будзе чэсьці, як станем адказываць „Маланцы“ на яе брахню.

Базыль П. —вершы Вашыя слабыя і дзеля гэтага быць зьмешчанымі ня могуць.

Дэрэчынскаму— аб тым, што развалініся самі сабой гурткі Грамады ў вёсках: Савічы, Угрынь і Залацеева ў Слонімскім павеце — асобна не падаем — бо Грамада ўжо аканчальна зьлікв'давана ўладай.

Богдановіч Аляксандар— Ваш верш будзе зьмешчаны. Прысылайце больш. Газэту высылаем.

Самайловіч Ціхан — яа газэту, так і ўсё іншае што просіце—высылаецца.

Гэрмановіч Міхал, Гурэцкі В., Гільдзюк Рыгор, Жытковіч Янка, Маляўка, Адамовіч, Маліноўскі Мікола, Дабрыян П.,—*газэту высылаем*.

Кардаш А. Далінскі Марцін, Пачопка Віктар, Ласкоўскі Вінцук, Пацкевіч Васіль, Лазар Базыль Мейсак Зьміцер, Петрашэвіч Уладзімер, Усьціновіч Юры, Нецюкевіч Раман, Вербіцкі Мікола, Валынец Ганна, Качаргін Янка, Апсёнак Міхал, Качан Кляўдыя, Дурэйко Ефім, Вербіцкі Кастусь, Хільмановіч Уладзімер, Лэшук Антон, Валынец Юльля, Акушка Міхась, Асіпевіч Тамаш, Касовіч Янка —*пробныя нумары „Беларускага Слова“ высылаем*.

Усячына.

Колькі каштуюць фабрыкі Форда.

Падчас працэсу ўраду проці некаторых уласьнікаў акцый фабрык Форда, якія не заплацілі падатку—выясьнілася што група ньюёрскіх банкіраў давала Форду за ягоныя фабрыкі тысячу мільёнаў даляраў. Прапанавалі яму прадаць фабрыкі некалькі разоў. Аднак Форд кожны раз адмаўляўся.

Японію чакае лёс Атлянтыды.

Галава амэрыканскага гэолёгічнага інстытуту др. Нобле, што нядаўна вярнуўся з Японіі, выклікаў моцнае ўражаньне сваім дакладам, які апіраецца на досьледах робленых у Японіі. Др. Нобле цьвердзіць, што гады краіны ўсходзючага сонца палічаны, і што ўсю тэрыторыю Японіі ў адносна кароткім часе чакае лёс Атлянтыды, ці морзаліе яе. Др Нобле цьвердзіць, што за 10,000 гадоў ня будзе і сьледу па Японіі.

Аэраплян у падводнай лодцы.

Францускі военны флёт у хуткім часе атрымлівае падводныя лодкі, у якіх будуць знаходзіцца аэрапляны. Гэтыя самалёты могуць выляцець з лодкі кожную хвілю, калі яна знаходзіцца на паверхні вады. Лятуны, выканаўшы сваё заданьне могуць зусім спакойна зьляцець ізноў на падводную лодку. Тут іх схаваюць.

Ад Адміністрацыі.

Адміністрацыя „Беларускага Слова“ зьвяртаецца з просьбай да падпісчыкаў — прыслаць адрасы сваіх знаёмых, каб мы маглі ім выслаць пробныя нумары нашае газэты.

Адміністрацыя.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.